# РАЗДЗЕЛ IX
# ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ

**Вольга Бардзіян**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

## ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ – НАЙВАЖНЕЙШАЯ САЦЫЯЛЬНАЯ НЕАБХОДНАСЦЬ

Тэма кадраў у сферы журналісцкай дзейнасці абмяркоўваецца ўжо даўно, але на сёння яна з’яўляецца найбольш актуальнай. У 1997 г. пасля правядзення атэстацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сродкаў масавай інфармацыі паўстала неабходнасць арганізацыі рэгулярнага павышэння іх кваліфікацыі. Пытанне разглядалася на пасяджэнні Калегіі Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку 9 студзеня 1998 г. У адпаведнасці з планам рэалізацыі мерапрыемстваў Савета Міністраў і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па выкананні даручэнняў Прэзідэнта ад 29 мая 1998 г. № 05/188 было вырашана арганізаваць у рэспубліцы перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі журналісцкіх кадраў.

Як вынік з 1 чэрвеня 1998 г. пры факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта на ўмовах самафінансавання загадам № 551-Д ад 11.06.1998 г. у адпаведнасці з Пагадненнем № 1-311 ад 27.05.1998 г. Дзяржкамітэта РБ па друку і БДУ адкрыты і пачалі дзейнічаць пастаянныя курсы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў кнігавыдання і сродкаў масавай інфармацыі.

Павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сродкаў масавай інфармацыі з’яўляецца важным сацыяльным рэсурсам у працэсе падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў Рэспублікі Беларусь, што дае магчымасць дынамічнага развіцця грамадства.

У рэчышчы выканання Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2005 г. № 800 «Аб зацвярджэнні комплекснай праграмы развіцця дзяржаўных перыядычных друкаваных выданняў у Рэспубліцы Беларусь на 2005–2008 гг.» курсы атрымалі новы імпульс сваёй дзейнасці (Загад № 483-АД ад 26.12.05 г.) і выйшлі на іншы ўзровень (за год праводзілася перападрыхтоўка да 100 супрацоўнікаў выдавецтваў і СМІ). За ўвесь перыяд функцыянавання курсаў павысілі кваліфікацыю каля 500

чалавек: карэспандэнты рэгіянальных перыядычных выданняў, якія працуюць з лістамі чытачоў, асвятляюць пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця і культуры; літаратурныя рэдактары і карэктары выдавецтваў і сродкаў масавай інфармацыі; адказныя сакратары рэдакцый газет рэспубліканскага і рэгіянальнага значэння; загадчыкі аддзелаў абласных, раённых і гарадскіх газет; спецыялісты па дызайне і камп'ютэрнай вёрстцы; рэдактары і творчыя работнікі шматтыражных газет Рэспублікі Беларусь; творчыя работнікі рэгіянальных тэлекампаній і інш.

На кожную групу слухачоў распрацоўваецца вучэбны план, у якім адлюстроўваюцца асноўныя накірункі грамадскага жыцця краіны, пытанні ідэалогіі беларускай дзяржавы, тэндэнцыі развіцця нацыянальнай журналістыкі, заканамернасці публіцыстычнага маўлення на сучасным этапе і іншыя аспекты дзейнасці ў галіне кнігавыдання і СМІ. Павышэнню прафесійнага майстэрства журналістаў садзейнічаюць майстар-класы вядучых навукоўцаў Інстытута журналістыкі: прафесара В. І. Іўчанкава, дацэнтаў А. К. Свораба, Н. М. Доўнар.

Абавязковым для кожнай групы слухачоў з'яўляецца правядзенне круглых сталоў «Спецыфіка карэктарскай працы: традыцыйнае і новае»; «Фінансы і прэса»; «Твор мастацтва ў люстэрку СМІ»; «Асвятленне на старонках рэгіянальнага друку пытанняў культуры, мастацтва, народнай творчасці: традыцыі, новыя формы, магчымасці», «Актуальная пытанні развіцця рэгіянальнага тэлебачання» і інш. Слухачы курсаў у перыяд навучання маюць магчымасць паслухаць лекцыі прадстаўнікоў міністэрстваў (А. М. Тур, А. І. Жук, Л. С. Ананіч, У. У. Матусевіч), рэдактараў і супрацоўнікаў рэспубліканскіх СМІ (П. І. Якубовіч, Л. А. Крушынская, У. У. Андрыевіч, А. У. Малочка).

Акрамя таго, у кожнай групе праводзяцца выязныя заняткі адпаведна з накірункам дзейнасці слухачоў: на базе Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя А. М. Горкага; у рэдакцыях газет («СБ – Беларусь сегодня», «Рэспубліка», «Звязда», «Железнодорожник Белоруссии», «Белорусский рынок»); у выдавецтвах «Беларускі Дом друку», «Адукацыя і выхаванне», «Народная асвета»; выдавецкім цэнтры БелТА; на розных каналах рэспубліканскага тэлебачання.

Падрыхтоўка і перападрыхтоўка спецыялістаў у галіне журналістыкі з'яўляецца неабходным складнікам ідэалагічнай працы, што стварае магчымасць для рэалізацыі адукацыйнай і інфармацыйнай палітыкі рэспублікі. Выпускнікі журфака БДУ працуюць ва ўсіх сферах дзейнасці беларускай дзяржавы. Таму надзённым з'яўляецца пытанне ўзаемадзеяння кадравай палітыкі і павышэння кваліфікацыі. У рэдакцыях газет рэгіянальных СМІ

працуе крыху больш за 25 % работнікаў з кваліфікацыяй «Журналіст». Самі спецыялісты СМІ зацікаўлены ў тым, каб працэс гэты быў бесперарыўны. З улікам неабходнасці ўдасканалення прафесійнага майстэрства, арганізацыі рэгулярнага павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў Рэспублікі Беларусь факультэт журналістыкі быў рэарганізаваны ў Інстытут журналістыкі БДУ, у складзе якога працуюць на сёння два факультэты: акадэмічны (факультэт журналістыкі) і факультэт павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў.